УДК 811.161.3

# ПАДАЎЖЭННЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ Ў ШКОЛЕ І ВНУ

**Савіцкая І.У., канд. філал. навук, дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле вызначаецца сутнасць падаўжэння ў сучаснай беларускай мове, разглядаюцца ўмовы яго ўзнікнення. Падаецца інтэрпрэтацыя тэрмінаў “фанетычнае падаўжэнне” і “марфалагічнае падваенне”.

Ключавыя словы: фанетычнае падаўжэнне, падоўжаныя гукі, марфалагічнае падваенне, артыкуляцыйныя асаблівасці гукаў.

# ELONGATION IN THE BELARUSIAN LANGUAGE: THE PROBLEM OF STUDYING AT SCHOOL AND UNIVERSITY

**Savitskaya I.V., associate professor**
*Belarusian National Technological University*
*Minsk, Republic of Belarus*

Summary: the article defines the essence of long consonants in the modern Belarusian language, considers the conditions of its occurrence. The interpretation of the terms “phonetics elongation” and “morphological doubling” is given.

Keywords: phonetics elongation, long sounds, morphological doubling, articulation features of sounds.

Адной з адметных рыс беларускай мовы з’яўляецца наяўнасць падоўжаных зычных гукаў. У школьным курсе беларускай мовы, як і ў дапаможніках для ВНУ, традыцыйна вывучаецца фанетычнае падаўжэнне, сутнасць якога заключаецца ў тым, што зычныя [з’], [дз’], [л’], [н’], [с’], [ц’], [ч], [ж], [ш] у становішчы паміж галоснымі могуць вымаўляцца падоўжана і на пісьме перадавацца праз падвоенае напісанне адпаведных літар: *граззю, суддзя, гуллівы.*

Аўтары падручнікаў прапаноўваюць адрозніваць ад фанетычнага падаўжэння марфалагічнае падваенне, калі зычныя знаходзяцца на стыку марфем: прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса, напрыклад, *пад-даць, з-заду, асен-ні, камен-ны.* Пры гэтым падвоеныя зычныя на стыку марфем даследчыкі часта разглядаюць як два аднолькавыя гукі, падкрэсліваючы, што "ў такім выпадку фанетычны аналіз не супярэчыць аналізу па саставу слова" [2, с. 16].

Пры такім падыходзе ўзнікае пытанне аб вызначэнні колькасці гукаў у словах з падоўжанымі і падвоенымі гукамі пры фанетычным разборы. Каб адказаць на гэтае пытанне, неабходна зразумець сутнасць з'явы падаўжэння ў беларускай мове. У Беларускай граматыцы адзначаецца, што падаўжэнне заключаецца "ў павелічэнні часу артыкуляцыі асобных фаз адпаведных гукаў: у змычных і змычна-шчылінных затрымліваецца ў часе змычка моўных органаў, у шчылінных больш доўга вытрымліваецца шчыліна паміж органамі мовы. Паколькі ў час артыкуляцыі змяняецца толькі адна яе фаза, то, безумоўна, артыкуляцыйна падоўжаныя змычныя, змычна-шчылінныя і шчылінныя зычныя ўяўляюць сабой адзінае гукавое ўтварэнне" [1, с 20].

Логіка падказвае, што артыкуляцыйна ўсе падоўжаныя зычныя ўяўляюць сабой адзін гук ва ўсіх выпадках, незалежна ад пазіцыі ў слове: паміж галосных у корані, у пачатку слова ці на стыку марфем. Ніякіх падстаў разглядаць падобныя гукі на стыку марфем ці ў пачатку слова як два аднолькавыя гукі, на наш погляд, няма. Адсюль з пункту погляду фанетыкі ў беларускай мове амаль усе зычныя ў розных пазіцыях могуць быць падоўжанымі: [б]: *аббрыць*; [б']: *аббіць*; [д]: *аддаць*; [дз']: *асяроддзе, паўгоддзе*; [ж]: *зжаць, левабярэжжа*; [з]: *ззаду, бяззубы*; [з']: *заззяць, палоззе*; [к]: *мякка, Мекка*; [к']: *мяккі*; [л']: *раздолле*; [н]: *заганнасць, бяздонны*; [н']: *шыпшыннік*; [с]: *рассыпаць, бяспрэчна*; [с']: *калоссе*; [т]: *адтуль*; [ц]: *абнаўляцца*; [ц']:*жыццё, вільгаццю*; [ч]: *ламачча*; [ш]: *мышшу*.

Падоўжаныя зычныя з'яўляюцца вынікам гістарычнага развіцця былых спалучэнняў "зычны + [ьj]": *палоззе ← полоз-ьj-е, заціша ← затиш-ьj-е* (параўнайце ў рускай мове: *полозья, затишье*). Аднак у іншых выпадках падаўжэнне не звязана са спалучэннямі "зычны + [ьj]". Так, з падзеннем рэдукаваных звязана ўзнікненне падоўжанага *н* у суфіксе -енн- (-энн-): *здаравенны, страшэнны*. Падаўжэнне *к'* у

слове *мяккі* таксама з'яўляецца вынікам падзення рэдукаваных у выніку асіміляцыйных працэсаў; "складаныя фанетычныя працэсы прывялі да ўтварэння падоўжанага *н'* у слове сёння (*сего дня → сегодня → сёдня → сёння*)" [3, с. 399].

Падаўжэнне назіраецца і пры прыпадабненні (асіміляцыі) шыпячых да свісцячых (*у бочцы – у бо[ц]ы, збіраешся – збірае[с'] я*) і свісцячых да шыпячых (*зжаць – [ж]аць, сшытак – [ш]ытак*), хоць некаторыя вучоныя падкрэсліваюць, што ў пачатку слова падаўжацца гукі не могуць, бо "спроба вымавіць у пачатку слова падоўжаны зычны прыводзіць не да падаўжэння, а да большай напружанасці або паўтарэння аднаго і таго ж гука двойчы" [1, с. 20)]. Адсюль, на іх думку, у словах тыпу *сшытак, зжаць* назіраюцца два аднолькавыя гукі:[*шшытак*], [*жжаць*]. Але факты паказваюць, што няма патрэбы размяжоўваць гукі ў залежнасці ад становішча ў слове. Так, калі параўнаць вымаўленне гукаў у словах *заціша і сшытак, збожжа і зжаць,* то відавочна, што [ш] і [ж ] артыкуляцыйна ўяўляюць сабой адзін гук, вымаўленне якога больш доўгае, чым звычайных зычных.

Ужыванне падоўжаных зычных у беларускай мове цесна звязана з тэматычнымі разрадамі лексікі, а таксама з пэўнымі граматычнымі формамі слоў. Так, падоўжаныя гукі ўжываюцца:

1) у зборных назоўніках: *маліннік, бадылле, крылле, сучча;*

2) у аддзеяслоўных назоўніках: *планаванне, жаданне, складанне;*

3) у прыставачных назоўніках са значэннем месца: *прыбярэжжа, узлессе, узвышша, зарэчча, падстрэшша;*

4) у складаных назоўніках і некаторых прыставачных з адценнем зборнасці: *стагоддзе, мелкаводдзе, многаўладдзе; беззямелле;*

5) у адпрыметнікавых назоўніках з адцягненым значэннем: *багацце, прыволле, вяселле, ранне;*

6) у назоўніках жаночага роду (яны могуць суадносіцца з назоўнікамі мужчынскага роду): *бягуння, пявуння, пападдзя, сваццця;*

7) у некаторых назоўніках з прадметным значэннем: *ладдзя, ружжо, келля, кассё, распяцце, ванна;*

8) у назоўніках 3-га скланення ў форме адзіночнага ліку творнага склону: *зеленню, моллю, ціш шу, печчу, вільгаццю;*

9) у назоўніках жаночага роду ў форме адзіночнага ліку меснага склону (пры асіміляцыі зычных): *у бочцы, у палатцы, аб дачцэ;*

10) у колькасных лічэбніках ад *адзінаццаці* да *дваццаці* і *трыццаць*, а таксама ў форме творнага склону лічэбнікаў *пяць, трыццаць* і ад *дзевяці* да *дваццаці*: *пяццю, дзесяццю, трыццаццю;*

11) у некаторых прыслоўях, утвораных ад назоўнікаў: *ноччу, рыссю, уваччу, ззаду;*

12) у прыставачных дзеясловах, назоўніках, прыметніках і інш. на стыку прыстаўкі і кораня: *аддаць, аддаленасць, раззлаваны;*

13) у вытворных прыметніках на стыку кораня і суфікса: *бяздонны, лімонны, дзённы, батальённы;*

13) у зваротных дзесловах тыпу *вучыцца, усміхацца, рыхтавацца*, у тым ліку і ў форме 2 асобы адзіночнага ліку (пры асіміляцыі зычных): *вучышся, усміхаешся, рыхтуешся.*

Такім чынам, артыкуляцыйна падоўжаныя зычныя ўяўляюць сабой адзіны элемент, які адрозніваецца ад адпаведных звычайных зычных часам гучання. Пры фанетычным разборы іх трэба разглядаць як адзін гук, незалежна ад пазіцыі ў слове: у пачатку, у сярэдзіне ці на стыку марфем. Падоўжаныя зычныя гукі на пісьме перадаюцца падвоеным напісаннем адпаведных літар. Адсюль мэтазгодна, на нашу думку, ужываць у практыцы выкладання мовы толькі тэрмін “падоўжаныя зычныя гукі”. Тэрміны “падвоеныя зычныя” і “марфалагічнае падваенне”, якія часта сустракаюцца ў падручніках, не маюць пад сабой грунтоўных падстаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа; рэд. М.В. Бірыла, П.П. Шуба. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 431 с.
2. Беларуская мова: Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаэпіі, граматыкі / А.І. Падлужны, Л.Ц. Выгонная, Г.К. Усціновіч [і інш.]; пад рэд. А.І. Падлужнага. – Мінск: Нар. асвета, 1987. – 144 с.
3. Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. праф. А.Я.Міхневіча. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 654 с.
4. Крывіцкі, А.А. Фанетыка беларускай мовы: вучэбны дапаможнік для філфакаў ВНУ / А.А. Крывіцкі, А.І. Падлужны. – Мінск: Вышэйшая школа, 1984. – 169 с.